

## Аляксандр Калбаска

прафесар Еўрапейскага Гуманітарнага Ўніверсітэта. 12 гадоў навучаўся; 12 гадоў працаваў над стварэннем гісторыка-культурнага запаведніка ЗАСЛАЎЕ (Беларусь); 12 гадоў завіхаўся над рэанімацыяй універсітэта ў выгнанні (Літва). Заснавальнік і першы кіраўнік Беларускага камітэта ІКОМ. Аўтар шэрагу навуковых публікацый. Сфера цікаўнасці: новая музеялогія і віртуальныя музеі.

# Пра (лічбавую) перспектыву для беларускіх музеяў

Аляксандр Калбаска

# On a (Digital) Perspective for Belarusian Museums

The article, written by EHU Prof. Dr. Aliaksandr Kalbaska, aims to determine the situation when European and Belarusian museums faced two challenges of our time: the total expansion of the digital world and the consequences of the COVID-19 pandemic. The author describes digitalization of two museums in Switzerland and Belarus and outlines the perspective museum trends. Proposals are being made of possible ways to develop museums in the short and medium-term perspectives, taking into account the existing risks and uncertainty in Belarus.

Ужніўні 2021 года Марк Цукерберг падзяліўся намерам цягам пяці гадоў накіраваць высілкі на стварэнне віртуальнага мета-сусвету [1]. Над пераходам да сітуацыі, пры якой віртуальная рэальнасць становіцца адным з элементаў асяроддзя будучага чалавецтва, працуюць даследчыкі і практыкі з кампаніі Майкрасофт [2]. Наколькі гатовыя Беларускія музеі стаць часткаю гэтага мета-сусвету? Ці хопіць чалавечага жыцця, каб заяўленая перспектыва стала рэальнаю для Беларусі?

Амаль немагчыма гаварыць адказна пра акрэсленыя перспектывы, нешта прагназаваць у сёняшняй Беларусі, у час, калі дафармаванне беларускай нацыі адбываецца не самым арганічным брутальным чынам. Пад нагамі дрыгва. За плячыма нядаўна прамінулая, а наперадзе чарговая непазбежная стагнацыя. Менавіта ў такую пастку трапляе спроба разважаць пра перспектывы ў любой галіне, што цепліцца ў краіне з назвай Беларусь. З аднаго боку, мы і ёсць Еўропа. Хай Усходняя, але ж Еўропа. Таму нашы (лічбавыя) рэаліі будуць часткаю Еўрапейскай перспектывы. З другога – ёсць досвед Старога Свету. І не толькі на захад ад Беларусі, але і далёка на ўсход.

Антыкавідная маска пад акуляры VR, якую выдаюць у Музеі выкапняў Монтэ-Сан-Джорджыо
Фота аўтара

Верагодна мае сэнс прыглядзецца да пэўных зрухаў, якія перажываюць грамадствы паабапал Беларусі ў дачыненні да музеяў. Намацаць, так бы мовіць, накірункі развіцця, адначасова ўсведамляючы, што Беларусь на гэтым шляху, па сумнай завядзёнцы, можа прыпазняцца на адно ці некалькі чалавечых жыццяў.

Агульным месцам, па меншай меры для 60 % насельнікаў зямлі, якія сябруюць з інтэрнетам, становіцца лічбавізацыя ўсяго. Чалавек, супольна з іншымі і аднаасобна, становіцца лічбава- і электрычна-залежным. Такая залежнасць дапамагае вырашаць асабістыя праблемы. Адкрываюцца бязмежныя ва ўсіх сэнсах магчымасьці хуткай камунікацыі: магчымасці падзяліцца думкамі з адна- ці супрацьлегла-думцамі, шукаць адказы на любыя пытанні і атрымліваць новыя веды, фіксаваць прыемныя і/ці сумныя моманты жыцця, арыентавацца ў прасторы (выбраць шлях, знайсці бліжэйшую краму, сябра/сяброўку), нарэшце сабраць у персанальным дэвайсе такія непахісныя яшчэ ў канцы XX стагоддзя аўтарытэты як газеты, радыё, тэлевізію, публічную трыбуну. Самых розных людзей лічбавы асяродак віртуальна аб’ядноўвае, адначасова яшчэ больш іх раз’ядноўваючы ў рэальнасці. Грамадства атамізіруецца. Знікае ці значна трансфармуецца звыклае адчуванне пляча. Лічбавая экспансія пагрозліва змяншае і без таго абмежаваныя кантакты людзей з навакольным асяроддзем, «з’ядае» наш вольны час. Адчуванне лёгкасці замены асабістай камунікацыі на віртуальную нясе інтравертам заспакаенне, экстравертам – трывогу. Да таго ж хуткая лічбавізацыя цягне за сабой абрэзкавасць хуткіх ведаў, адсутнасць сувязаў паміж бітамі інфармацыі, ужыванне і памнажэнне неправеранай, а часцяком ілжывай інфармацыі. Урэшце, немагчымасць нідзе схавацца ад лічбавага пераследу ды застацца хоць на некалькі хвілін сам насам. Віруе страх быць адсочаным, улічаным, зафіксаваным, знятым, захаваным, знойдзеным  без тваёй волі і жадання.

А што музеі? Музеі ёсць звыклым адбіткам грамадства з усімі яго дасягненнямі ды хібамі.

Лічбавая абазнанасць нямінуча дыктуе музейныя змены. Станоўчыя і адмоўныя, чаканыя і не вельмі. Лічбавая рэальнасць падступаецца да музеяў з розных бакоў. Калі напачатку свайго існавання музей дазваляў сабе абмежавана дапускаць да сябе людзей, то потым стаў заклікаць і заваблiваць да баўлення вольнага часу як унутры музейных сценаў, так і па-за іх межамі, але пад уласна музейным кантролем. Зараз лічбавая камунікацыя спрыяе больш глыбокаму і эмацыянальна насычанаму знаёмству са зместам экспазіцый. Яна ж адначасова прапануе наведвальніку пераносіць змест музея дахаты: на сцяну хатняга кінатэатра, на экран кампутара, ва ўласныя акуляры і гадзіннікі. Чалавек неўзабаве сам будзе выбіраць не толькі, калі і куды, але і якую частку якога музея і ў якой колькасці дапускаць да (у) сябе. Музею ж вырашаць, як гэтую пагрозу ператварыць у дадатковую магчымасць.

Навошта музею быць патрэбным чалавеку ў лічбавай форме? Па сваёй прыродзе людзі маюць жаданне цяпліць у душы станоўчыя эмоцыі. Многім з іх і надалей будуць даспадобы міфалагічныя цікавосткі з мінулага, у тым ліку уласнага. Нідзе не падзенецца патрэба ведаць пра станаўленне пэўнай тэрыторыі, суполкі людзей альбо паходжанне ідэй. Музеі пра гэта апавядаюць, падмацоўваючы створаныя міфы дэманстрацыяй рэальных ці віртуальных музейных прадметаў. Музейныя гісторыі будуць і далей дапамагаць бавіць вольны час, кампенсуючы ўяўленне пра рэальнасць віртуальнымі сродкамі. Відавочна змяншаюцца абмежаванні для наведвання музеяў  па часе і месцы. Гіне адчуванне межмузейных межаў, музейнай прыналежнасці, музейнай маёмасці/уласнасці. Кожны зацікаўлены наведвальнік/карыстальнік музея зможа ствараць уласныя

калекцыі са збораў любых прадметаў любых музеяў.

Варта пры гэтым мець на ўвазе абмежаванні, якія пандемія COVID-19 наклала на ўзаемадзеянне музеяў з аўдыторый: ад праблемы памяншэння колькасці фізічных наведвальнікаў аж да іх страты і закрыцця саміх музеяў. Пра гэта сведчаць статыстычныя дадзеныя, атрыманыя ў выніку апошніх даследаванняў Сеткі еўрапейскіх музейных арганізацый NEMO (Network of European Museum Organisations) [3]. У той самы час відавочна адкрыццё новых магчымасцяў, што выявілася ў актывізацыі фармату ўзаемадзеяння музеяў з наведвальнікамі праз сацыяльныя сеткі. Лягчэй знаходзіліся спробы заставацца бачнымі, захоўваць індывідуальнасць, кантактаваць з аўдыторыяй, прасоўваць уласны прадукт. Больш складаным было зрабіць прадукт лічбавым: ад ужывання лічбавых знаходак у дзейсных экспазіцыях да анлайн-экскурсіяў.



У першай палове 2021 года, бяручы да ўліку ўсе неабходныя каранавірусныя абмежаванні, мне з невялікім перарывам давялося наведаць тузін музеяў у Заходняй Еўропе і Беларусі. Возьмем для параўнання два з іх. Музей выкапняў Монтэ-Сан-Джорджыо [4] і Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі [5].

Музей выкапняў Монтэ-Сан-Джорджыо, якія занесены ў спіс ЮНЕСКА, знаходзіцца ў маленечкай вёсцы Мерыдэ (335 насельнікаў) кантона Тычына, заціснутай у гарах на поўдні Швейцарыі. Не зважаючы на кавідныя абмежаванні і няпростую дасягальнасць, музей у будні дзень быў напоўнены наведвальнікамі. Школьная група, бацькі з дзецьмі, пенсіянеры парамі. Чарга на касе. Карткі ІКОМа не выклікаюць падазронай цікаўнасці, спрацоўваюць. На трох паверхах музейнай прасторы, аб'яднанай адкрытымі ўсярэдзіну будынка галерэямі і выхадамі з кожнага паверха на тэрасы, месцяцца артэфакты, якім налічваецца больш за 240 мільёнаў гадоў. Рэальныя выкапні былі раскапаны, навукова апісаны і даследаваны швейцарскімі і італьянскімі экспертамі яшчэ ў 1850 годзе. Экспануюцца адбіткі марскіх водарасцяў, мідый, аманітаў, рыбаў ды рэптылій, а таксама асобныя прыклады касцякоў наземных дыназаўраў, насякомых і раслін, вымытых у мора з астравоў ці мацерыка. Ілюстрацыі і мадэлі тлумачаць наведвальнікам даўно вымерлы свет.

У большасці залаў вольна ўладкаваныя пара-тройка планшэтаў, якія дазваляюць ажыўляць трохмерную прастору вітрын.

Інтэрактыўныя экраны на маршруце прапануюць магчымасць убачыць, як саступала мора, пакідаючы на гарах наносы. Можна, прысеўшы ў экспазіцыйнай зале, пазнаёміцца з гісторыяй адкрыцця і вывучэння выкапняў у сярэдзіне XIX стагоддзя у фармаце мульціка, зразумелага самым маленькім наведвальнікам. На любой з 4-х моваў. Самы захапляльны момант падчас знаходжання ў музеі: наведвальнікі з унутранага дворыку па адным могуць патрапіць у маленькую залу.

Там, седзячы ва ўтульным крэсле пасярэдзіне залы, надзеўшы віртуальныя акуляры па-над індывідуальнай антыкавіднай маскай, адразу трапляеш у тоўшчу вады. Паабапал, пад табою і над галавою – толькі паспявай ухіляцца – сноўдаюць па адной і зграйкамі марскія істоты. Акурат як тыя, чые парэшткі выстаўлены ў экспазіцыі.

Нацыянальны музей гісторыі і культуры рэспублікі Беларусь, краіны-заснавальніцы ААН, камфортна месціцца ў Мінску (колькасць насельнікаў блізу 2-х мільёнаў), у цэнтры сталіцы за ганкам з пушкаю.

Музей сустрэў першага і адзінага наведвальніка далікатнай цікаўнасцю касіркі датычна персанальнай карты ІКОМа. Давялося патлумачыць, што гэта за дзіўная картка, якая арганізацыя і чаму дае права ўласніку наведваць іх музей бясплатна.

Варта адразу адзначыць дзве прынцыповыя акалічнасці. Па кепскай традыцыі, якая ў Еўропе выклікала крытыку яшчэ ў XIX стагоддзі, у Беларусі дагэтуль музейнае прадстаўленне гісторыі і культуры ніяк не перакрыжуецца з гісторыяй прыроднага асяроддзя і жывёльнага свету. Яны разглядаюцца і экспануюцца ў розных залах і нават будынках, рознымі музейнымі ўстановамі.

Праз некалькі апошніх дзесяцігоддзяў становіцца традыцыяй іншая спецыфіка Нацыянальнага музея: дагэтуль беларускае грамадства не мае аргументаванага і кансалідаванага разумення ўласнай гісторыі, асабліва XX і першай чвэрці XXI стагоддзяў. Гэта не дае магчымасці адлюставаць у стацыянарнай экспазіцыі гісторыю краіны, стварыць экспазіцыю, якая б прэзентавала наведвальнікам усю паўнату захапляльнай і пакутлівай гісторыі і культуры Беларусі з усімі яе выклікамі і праблемамі. Сёння сталая зкспазіцыя Нацыянальнага музея носіць назву «Старажытная Беларусь», займае адну залу, прадстаўляючы перыяд ад неаліта да канца XIX стагоддзя. Адсутнасць цэльнага погляду на нацыянальную гісторыю і культуру не здольныя кампенсаваць ані выстава магнацкіх партрэтаў эпохі Вялікага Княства Літоўскага, ані сціплы музейны эксперымент пад назваю «Археалогія смерці», ані рэкламная выстава «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры», ані інтэрактыўныя праграмы з магчымасцю выкарыстаць «варштат Скарыны» ці прапанова дзецям пагуляць на пляцы-імітацыі Палескага падвор'я. Ні паасобку, ні ўсе разам.

Можна, праўда, па дарозе ў гардэроб ці прыбіральню ў сутарэннях таго ж будынка на ўласную рызыку зазірнуць у экспазіцыю Рэспубліканскага музея прыроды і экалогіі, каб ізноў апынуцца першым і адзіным наведвальнікам, расказаць пра цудадзейную картку ІКОМа, убачыць традыцыйныя для канца XIX стагоддзя дыярамы, якія расказваюць пра колішняе жыццё птушак, звяроў, балотаў і падводнага свету.

А з лічбавымі тэхналогіямі ў экспазіцыях што? У абодвух музеях атрымалася налічыць тры маніторы. Адзін стацыянарны ў музеі прыроды і экалогіі і аж два (стацыянарны і перасоўны) у Нацыянальным музеі. Гаваркая супрацоўніца, кіраваўшая працаю па перасоўванню другога манітора паміж заламі музея, з ахвотай адгукнулася на пытанне пра лічбавыя сродкі камунікацыі ў экспазіцыі Нацыянальнага музея. Запэўніла, паказаўшы на сіратлівы стэнд-афішу на ўваходнай сцяне адной з залаў, што віртуальныя акуляры ў музеі маюцца, але яны прыбраныя з-за пандэміі. Пра спецыяльныя індывідуальныя антыкавідныя маскі, якія зараз ужываюцца ў іншых музеях, каб засцерагчы твар карыстальніка ад наўпроставага кантакту з акулярамі яна нічога не чула. Але з абурэннем адзначыла, што гэта будзе толькі спрыяць пашырэнню пандэміі. З гонарам дадала, што Нацыянальны музей зараз рыхтуецца ўжыць у экспазіцыі планшэты. На пытанне, чаму толькі зараз, быў дадзены вычарпальны адказ: «Москва не сразу строилась». Ну і што тут дадаць...

На жніневеньскім гібрыдным міжнародным сімпозіуме ІКОМ 2021 года кіраўніца офіса Цэнтра глабальнай адукацыі кампаніі Майкрасофт Кацярына Дэвін спынілася на пяці тэхналагічных магчымасцях, якія зараз лічбавы свет прапануе музеям [6]. Зацікаўленым музейным спецыялістам, працягваючы неуўміручую думку Дэйла Карнегі пра лімон і ліманад, былі акрэслены прываблівыя контуры магчымай будучай глабальнай стратэгіі выкарыстання ўзніклых абмежванняў дзеля непазбежных пераменаў. Маючы досвед папярэдняй працы з лічбавымі тэхналогіямі ў Прыродазнаўчым музеі Нью-Йорка, калега раіць найперш рухацца ў бок выкарыстання штучнага інтэлекту і яго складнікаў. Каб палегчыць працу супрацоўнікаў тых аддзелаў фондаў, якія дзесяцігоддзямі, калі не стагоддзямі, шчыруюць над апісаннем музейных калекцый: ад карпатлівага распазнавання рукапісных тэкстаў да апісання фота і мастацкіх выяваў.

Не менш важнымі накірункамі магчымага развіцця музеяў, па думцы прадстаўніцы кампаніі Майкрасофт, мусіць стаць выкарыстанне змяшанай рэальнасці для захаплялльнага (імерсіўнага) віртуальнага навучання і гібрыднае (змяшанае) працоўнае ўзаемадзеянне. У дачыненні да музеяў гэта можа быць віртуальная экскурсія ці змяшаная камунікацыя па-за наведваннем экспазіцыі са спецыялістам у дадзенай галіне. Спецыяліст прысутнічае ў віртуальнай прасторы вашых акуляраў у выглядзе двайніка-аватара і бярэ актыўны ўдзел у экскурсіі, лекцыі або даследванні. Ці проста дапаўняе візуальны шэраг неабходнай эмацыйна-афарбаванай інфармацыяй. Тое, што мае неўзабаве паступова ператварацца ў мета-сусвет.

Відавочна, музеям варта выкарыстаць неверагодую колькасць дадзеных, якія, дзякуючы лічбавым тэхналогіям, могуць збірацца вакол кожнага руху любога наведвальніка. Абапіраючыся на атрыманыя дадзеныя, вывесці на новы ўзровень веды пра тое, як працуюць ці не працуюць розныя музейныя праграмы, экспазіцыі, як выкарыстоўваюцца музейныя плошчы.

І нарэшце, лічбавыя тэхналогіі змогуць паменшыць галаўны боль захавальнікаў і адміністратараў музеяў, забяспечыўшы кантроль і падтрыманне аптымальных для захаванасці музейных прадметаў тэмпературы, вільгаці ды асвятлення.

Калі мая краіна Беларусь стане нарэшце адначасова незалежнай, нейтральнай і багатай, тады (лічбавая) будучыня экспазіцый Нацыянальнага музея і іншых музеяў наблізіцца да сёняшняга стану вясковага Швейцарскага музея выкапняў. Вось толькі калі? І ці будзе той чакаць нас скамянелым у сваім сёняшнім?

Выкарыстаная літаратура


[1] Facebook launches "Horizon Workrooms."Here's how it works // https://www.youtube.com/watch?v=frZQrEBVkkk (30.08.2021).

[2] Building Digital Twins, Mixed Reality and Metaverse Apps // https://www.youtube.com/watch?v=GAkB98ewcjI (25.07.2021).

[3] NEMO Final Report on the impact of the COVID-19 pandemic on museums in Europe // https://culture360.asef.org/resources/nemo-final-report-impact-covid-19-pandemic-museums-europe/ (25.07.2021).

[4] Museo dei fossili del Monte San Giorgio // https://www.myswitzerland.com/en/experiences/fossil-museum-monte-san-giorgio/ (21.04.2021).

[5] Нацыянальны музей гісторыі і культуры рэспублікі Беларусь // http://histmuseum.by (10.08.2021).

[6] The ICOM Prague International Symposium 2021 // https://icomprague2021.gcon.me/page/home (26.08.2021).